## 23-га ЛЮТАГА—ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТУ



Малюнак А. С. Буткоўскага. (БЕЛТА).


ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 5 (244) | Субота, 19 лютага 1977 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.


# НА ВАРЦЕ ЗАВАЁЎ КАСТРЫЧНІКА

**Ні ў кога не павінна быць сумненняў і ў тым, што наша партыя будзе рабіць усё, каб слаўныя Узброеныя Сілы Савецкага Саюза і ў будучым валодалі ўсімі неабходнымі сродкамі для выканання сваёй адказнай задачы — быць вартавым мірнай працы савецкага народа, апорай усеагульнага міру.**

**(Матэрыялы XXV з'езда КПСС. М., 1976, с. 83).**

Мінула 59 гадоў з таго часу, як у баях супраць ворагаў маладой Савецкай рэспублікі нарадзіліся нашы абвеяныя славай Савецкая Армія і Ваенна-Марскі Флот. Створаныя У. І. Леніным, Камуністычнай партыяй, яны верна служаць сацыялістычнай Айчыне, абараняюць справу рэвалюцыі, сацыялізму і міру паміж народамі. Не было ў гісторыі арміі, якая б служыла такім гуманным і высокім мэтам і ідэалам. Таму вялікім гонарам і ўсенароднай павагай акружаны савецкія воіны.

У грозныя гады грамадзянскай вайны і замежнай ваеннай інтэрвенцыі маладая Чырвоная Армія праявіла высокі рэвалюцыйны дух, масавы гераізм і адвагу, непераўзыйдзеныя маральна-баявыя якасці. Бессмяротны подзвіг у імя сацыялізму здзейснілі савецкі народ і яго Узброеныя Сілы ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэта была вайна за свабоду і незалежнасць сацыялістычнай Радзімы, за выратаванне сусветнай цывілізацыі ад фашысцкага іга, за будучы справядлівы мір.

З тых пор, як былі разгромлены ўдарныя сілы міжнароднага імперыялізму — гітлераўская Германія і мілітарысцкая Японія, прайшло больш трыццаці гадоў. Увесь гэты час Савецкая Армія і Ваенна-Марскі Флот пільна стаяць на ахове бяспекі нашай Радзімы і ўсяго сацыялістычнага супрацоўніцтва. Пасляваенны этап будаўніцтва Узброеных Сіл характарызуецца далейшым павышэннем ролі кіраўніцтва Камуністычнай партыі ўсёй іх дзейнасцю. Як адзначыў XXV з'езд КПСС, усеагульны мір у нашы дні поўнасцю не гарантаваны. Мілітарысцкія імперыялістычныя колы працягваюць гонку ўзбраенняў. Таму пярвейшымі задачамі застаюцца ўмацаванне абараназдольнасці краіны і баявога саюза краін — удзельніц Варшаўскага Дагавору, усямернае павышэнне пільнасці і баявой гатоўнасці Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту. Савецкія воіны з гонарам і дастойнасцю выконваюць свой патрыятычны і інтэрнацыянальны абавязак.

## ІМЯННЫЯ СТЫПЕНДЫЯТЫ

Па рэкамендацыі факультэтаў Вучоны савет універсітэта прызначыў лепшым студэнтам імянныя стыпендыі на другі семестр бягучага навучальнага года. Ленінскіх стыпендый за выдатную вучобу і актыўную грамадскую дзейнасць удастоены пяцікурснікі: **М. Беразоўская** — з гісторыка-філалагічнага, **М. Дзенісенка** — з механіка-матэматычнага, **В. Громаў** — з эканамічнага, **М. Нікіцін** — з біялагічнага факультэтаў; чацвёртакурснікі: **В. Драбышэўскі** — з эканамічнага і **Л. Любезны** — з фізічнага факультэтаў. Пяцікурсніку гісторыка-філалагічнага факультэта **У. Гаркушу** прызначана стыпендыя імя Янкі Купалы.

**«КАМУНІСТЫЧНУЮ ІДЭЙНАСЦЬ, АКТЫЎНУЮ ЖЫЦЦЕВУЮ ПАЗІЦЫЮ — КОЖНАМУ КАМСАМОЛЬЦУ!» — З ТАКІМ ПАРАДКАМ ДНЯ ПРАХОДЗІЦЬ У ГЭТЫЯ ДНІ ЎСЕСАЮЗНЫ КАМСАМОЛЬСКІ СХОД**

# АДНАДУШНАЕ ІМКНЕННЕ ПЕРШАКУРСНІКАЎ

Пра групу Б-13 на гісторыка-філалагічным факультэце сёння гавораць як пра адну з лепшых. Навічкі зарэкамендавалі сябе з добрага боку ў многіх справах. Што датычыцца паспяховасці, дык на філалагічным аддзяленні сярод першакурснікаў па выніках першай сесіі яна ў гэтай групе самая высокая. Гэта дасягнута дзякуючы самаму актыўнаму наведванню лекцыйных і семінарскіх заняткаў, вялікаму старанню будучых філолагаў. За першы семестр сваёй вучобы ў групе праведзена нямала карысных, цікавых мерапрыемстваў. Аднак перад Усесаюзным камсамольскім сходам гэта нікому не дало повада супакоіцца. Кожны камсамолец групы па-сур'ёзнаму задумваўся, што яшчэ трэба зрабіць, каб студэнцкае жыццё было яшчэ больш паўнакроўным, а здабыткі ў вучобе і грамадскай дзейнасці — яшчэ больш значнымі. Таму і сход у групе прайшоў па-дзелавому, на высокім арганізацыйным узроўні.

З дакладам выступіла камсамолка Надзежда Царанок. Яна адзначыла, што ўсе савецкія людзі цяпер рыхтуюць дастойную сустрэчу знамянальнаму юбілею — 60-годдзю Вялікага Кастрычніка. Працоўны энтузіязм і прыліў творчых сіл выклікала ў іх пастанова ЦК КПСС «Аб 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі». Да многага яна абавязвае і студэнцкую моладзь, камсамольцаў, усіх юнакоў і дзяўчат.

Выступіўшыя ў абмеркаванні даклада члены камсамольскага бюро групы Ніна Андык, адказная за работу акадэмічнага сектара, Зінаіда Булахава (ідэалагічны сектар), Наташа Курбан (культурна-масавая работа), сакратар камсамольскай арганізацыі Марыя Сідарэйка і іншыя члены ВЛКСМ выказвалі канкрэтныя прапановы, што трэба зрабіць, каб дзень ад дня ў групе мацнелі таварыскасць і ўзаемаразуменне, павышалася паспяховасць, усё цікавейшым станавілася студэнцкае жыццё.

Усё гэта знайшло адлюстраванне ў прынятай пастанове.

Камсамольскі сход, у рабоце якога ўдзельнічала і куратар групы Л. В. Карабанава, засведчыў аб аднадушным імкненні першакурснікаў высока трымаць марку савецкага студэнта, выдатнай вучобай і ўсімі сваімі справамі заўсёды апраўдваць гэта ганаровае званне, выхоўваць у сабе камуністычную ідэйнасць, выпрацоўваць актыўную жыццёвую пазіцыю будаўніка камуністычнага грамадства.

Усесаюзны камсамольскі сход прайшоў ужо і ў іншых групах гісторыка-філалагічнага, а таксама геалагічнага і эканамічнага факультэтаў. У наступныя дні ён адбудзецца ва ўсіх астатніх пярвічных арганізацыях.

Студэнты ўніверсітэта абмяркоўваюць важнейшыя задачы, якія ставіць перад імі партыя, камсамол. Можна з упэўненасцю сказаць, што ніхто не пашкадуе сіл, каб выканаць іх з гонарам.

Універсітэцкая камсамолія трымае рэвалюцыйны крок, рыхтуе дастойную сустрэчу слаўнаму юбілею сацыялістычнай Радзімы!

**Б. ВАЛОДЗІН.**

**ЗНАМЯНАЛЬНЫМ ДАТАМ ПРЫСВЕЧАНЫ**

# ЗОРНЫ ПАХОД

У мінулы панядзелак з раніцы ля вучэбнага корпуса № 1 панавала ажыўленне. Адсюль браў старт традыцыйны лыжны паход студэнтаў універсітэта па месцах рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа. Сёлета ён прысвячаецца 60-годдзю Вялікага Кастрычніка, 59-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту і 50-годдзю ДТСААФ. Для таго, каб паход прайшоў цікава і запамінальна, да яго была праведзена вялікая падрыхтоўчая работа пад кіраўніцтвам выкладчыка кафедры фізвыхавання А. С. Суворава.

І вось роўнай шарэнгай выстраілася калона лыжнікаў. У ёй — студэнты ўсіх факультэтаў. Разам са студэнцкай моладдзю — начальнік зорнага паходу А. С. Сувораў, кіраўнікі груп выкладчыкі кафедры фізвыхавання П. П. Саковіч, Ф. М. Семяненка, А. С. Чуяшоў, Г. П. Куцэнка, Б. Г. Дзмітрыеў, А. М. Савенка.

Аддаецца рапарт аб гатоўнасці студэнтаў адправіцца ў зорны паход. У многіх з іх праз плячо павязаны пунсовыя стужкі са словамі «Гомельскі ўніверсітэт», «Слава КПСС!», «Слава партыі!», «Слава працы!», «Пяцігодку — датэрмінова!», «50 год ДТСААФ», «Пяцігодцы — ударную працу!» і інш.

Да ўдзельнікаў паходу з цёплымі словамі звярнуліся прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню А. І. Балтоўскі і старшыня камітэта ДТСААФ У. А. Дзем'янкоў.

Калона лыжнікаў накіроўваецца на цэнтральную плошчу Гомеля, якая носіць імя арганізатара Камуністычнай партыі і стваральніка першай у свеце Савецкай дзяржавы, правадыра ўсіх працоўных Уладзіміра Ільіча Леніна. Тут да пастамента помніка дарагому Ільічу былі ўскладзены кветкі.

З цэнтральнай плошчы горада ўдзельнікі паходу адпраўляюцца на аўтобусах у раёны вобласці. Адтуль яны пройдуць на лыжах дзесяткі кіламетраў па памятных мясцінах, сустрэнуцца з цікавымі людзьмі, выступяць з лекцыямі і канцэртамі.

Заўтра ўсе групы фінішуюць на цэнтральнай плошчы Мазыра. Тут адбудзецца сустрэча з працоўнымі і моладдзю горада беларускіх нафтавікоў, пройдзе мітынг, прысвечаны знамянальным датам у жыцці савецкага народа.

**На здымку:** удзельнікі зорнага паходу на цэнтральнай плошчы імя У. І. Леніна ў Гомелі.

Фота **А. Карніенкі.**



